Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________А. А. Корбут
«____» _____________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/ вуч.

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства*
*(інтэграванае), спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтва*

2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21 04 02-2013 па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках) і вучэбнага плана па спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01 Кампаратыўнае мастацтва, рэг. № Д 21-1-13 / 13 вуч. ад 27.06.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. М. Нікіфарэнка*, дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

аддзел выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі (ДНУ «Цэнтр даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»), пратакол № 11 ад 05.11.2015 г.;

*К. А. Бандарэнка,* дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 18.01.2016 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 26.04.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. М. Нікіфарэнка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Матэрыяльная культура Беларусі» распрацавана для студэнтаў спецыялізацыі «кампаратыўнае мастацтвазнаўства». Праграма прадугледжвае аналіз розных відаў матэрыяльнай культуры Беларусі ў кантэксце гістарычных, сацыяльных, этнаграфічных, рэлігійных асаблівасцей краіны. Студэнты паслядоўна знаёмяцца з рознымі відамі пасяленняў, іх планіроўкамі, збудаваннямі, інтэр'ерам, мэбляй, асвятляльнымі прыборамі, посудам, касцюмам, нацыянальнай ежай. У асобных тэмах прадугледжаны аналіз прадметаў рамеснай дзейнасці, ювелірных упрыгажэнняў, вопраткі і даспехаў воінаў, музычных інструментаў, сцэнаграфіі і інш.

Вучэбная дысцыпліна «Матэрыяльная культура Беларусі» звязана з шэрагам іншых дысцыплін – «Гісторыя Беларусі», «Сацыялогія», «Гісторыя мастацка-матэрыяльнай культуры: ад вытокаў да пачатку ХХ ст.», «Гісторыя мастацтваў», «Аналіз твораў мастацтва» і інш.

У працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны «Матэрыяльная культура Беларусі» фарміруюцца наступныя *кампетэнцыі спецыяліста*:

– уменне прымяняць базавыя веды ў галіне гуманітарных і сацыяльна-эканамічных навук для вырашэння прафесійных задач мастацтвазнаўства;

– прадстаўленне сучаснай карціны свету на аснове цэласнай сістэмы гуманітарных ведаў;

– уменне працаваць самастойна;

– свабоднае прымяненне прафесійнай тэрміналогіі;

– арыентаванне ў каштоўнасцях быцця, жыцця, культуры беларускага народа;

– валоданне інфармацыяй у галіне гісторыі Беларусі і іншых краін славянскага свету;

– разуменне заканамернасцей гістарычнага працэсу для ўзбагачэння зместу сваёй даследчай дзейнасці;

– разуменне светапоглядных і сацыяльна значных праблем беларускага народа пэўнай эпохі;

– уменне фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– паважліва і асцярожна ставіцца да нацыянальных традыцый і гісторыка-культурнай спадчыны розных народаў і краін славянскага свету;

– уменне распрацоўваць і выкарыстоўваць сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

*Мэтай вучэбнай дысцыпліны* з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў гісторыка-тэарэтычных уяўленняў аб матэрыяльнай культуры Беларусі, яе эвалюцыі і ролі ў жыцці чалавека і грамадства.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– сістэматызацыя ведаў па гісторыі беларускай матэрыяльнай культуры;

– пошук і апрабацыя метадалогіі аналізу матэрыялаў, тэхнік, прыёмаў, мастацкіх асаблівасцей, спецыфікі функцыянавання выдатных аб’ектаў беларускай матэрыяльнай культуры канкрэтнай эпохі;

– асваенне на практыцы тэарэтычных асноў матэрыяльнай культуры Беларусі.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Матэрыяльная культура Беларусі» студэнты павінны *ведаць:*

– сэнс і прызначэнне матэрыяльнай культуры;

– этапы развіцця матэрыяльнай культуры Беларусі;

– асноўныя гістарычныя факты, падзеі, віды матэрыяльнай культуры.

Студэнты павінны *ўмець:*

– аналізаваць заканамернасці развіцця матэрыяльнай культуры Беларусі ў пэўныя перыяды развіцця краіны;

– валодаць тэрміналагічным апаратам вучэбнай дысцыпліны;

– праводзіць кантэкстуальны аналіз твораў матэрыяльнай культуры;

– выяўляць мастацкія асаблівасці матэрыяльных прадметаў розных эпох;

– выкарыстоўваць набытыя веды ў практыцы распрацоўкі матэрыялу курса і выкладання гісторыі матэрыяльнай культуры ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Студэнт павінен *валодаць*:

– вуснай і пісьмовай камунікацыяй;

– навыкам навуковага даследавання па выяўленні, апісанні, аналізе, рэцэнзаванні твораў матэрыяльнай культуры Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– уменнем працаваць з дакументальнымі, архіўнымі, іканаграфічнымі і іншымі матэрыяламі ў сваёй мастацтвазнаўчай дзейнасці;

– прынцыпамі і прыёмамі збору, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследаванняў у канкрэтных галінах матэрыяльна-мастацкай культуры.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Матэрыяльная культура Беларусі» ўсяго прадугледжана 116 гадзін, з якіх 42 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне па відах заняткаў: лекцыі – 20 гадзін, семінары – 14 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Тэма 1. Уводзіны. Сувязь мастацка-матэрыяльнай культуры Беларусі з іншымі навукамі гуманітарнага цыкла*

Мастацка-матэрыяльная культура Беларусі як дысцыпліна гуманітарнага цыкла. Гісторыя, этнаграфія і мастацтвазнаўства як асноўныя крыніцы звестак пра мастацка-матэрыяльную культуру. Роля археалогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, педагогікі і фалькларыстыкі ў фарміраванні і развіцці матэрыяльнай культуры Беларусі. Асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі (перыядызацыя; фарміраванне асноўных народнасцей; княства і дзяржавы; замацаванне незалежнасці Беларусі).

*Тэма 2. Мастацка-матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце рэлігійных вераванняў славян*

Фарміраванне і асаблівасці развіцця асноўных вераванняў на тэрыторыі беларускіх зямель. Асноўныя вераванні першабытнага ладу (анімізм, фетышызм, татэмізм, культ продкаў і інш.). Узаемасувязь духоўнай і матэрыяльнай культуры ў абрадах. Сутнасць трыяды «слова – дзеянне – прадмет» у розных культах славян. Шаманізм і магія сярод вераванняў славян. Фарміраванне і зацвярджэнне паганства. Політэізм і яго матэрыяльная атрыбутыка. Свяцілішча, капішча, трэбішча ў абрадавай культуры беларусаў. Разнастайнасць абярэгаў і іх роля ў паганстве. Уплыў хрысціянскіх традыцый на развіццё мастацка-матэрыяльнай культуры. Сувязь паганства і хрысціянства ў светаўспрыманні і матэрыяльнай культуры беларусаў.

*Тэма 3. Паселішча на тэрыторыі беларускіх зямель*

Асаблівасці выбару месца для рассялення: геаграфічнае асяроддзе (вадаёмы, раўніна), асаблівасці гаспадаркі (урадлівасць глебы, лес), камунікацыя. Асаблівасці рассялення беларусаў на поўначы, поўдні, у цэнтральнай частцы і на Палессі. Гістарычныя і сацыяльныя асаблівасці фарміравання паселішчаў на беларускіх землях. Асноўныя тыпы паселішчаў (вёска, сяло, аколіца, слабада, засценак, фальварак, хутар, мястэчка, горад, аграрны гарадок, катэджны пасёлак): гістарычныя і сацыяльныя ўмовы ўзнікнення, адметныя рысы, функцыянальнасць, тыпы жыхароў, спецыфіка гаспадаркі, асноўныя формы планіроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Драўлянае і каменнае дойлідства на беларускіх землях*

Асноўныя віды драўлянай культавай архітэктуры ў Беларусі (царква, касцёл, званіца, капліца, мячэць, сінагога, крыж і мемарыяльныя помнікі): рэлігійныя асаблівасці, аб'ёмна-прасторавае вырашэнне, планіроўка, архітэктурныя тэхнікі і прыёмы, дэкаратыўнае аздабленне. Грамадскія збудаванні (ратуша, школа, харчэўня, тэатральна-відовішчныя забудовы): функцыянальная прыналежнасць, асаблівасці планіроўкі і дэкору. Уплыў каменнага дойлідства на драўляную архітэктуру (мастацкія кірункі, тэхнікі, матэрыялы, разнастайнасць упрыгожвання і г. д.). Архітэктурнае вырашэнне беларускіх мястэчак, гарадоў, катэджных пасёлкаў. Беларускі і заходнееўрапейскі горад: падабенства і адрозненні. Сядзібна-палацавы комплекс на тэрыторыі беларускіх зямель: структура і планіроўка, забудовы, функцыі, архітэктурны выгляд.

*Тэма 5. Сядзіба як асноўная частка жыллёвага комплексу*

Сядзіба ў жыллёвым комплексе гаспадара. Асноўныя віды сядзіб: сялянская, шляхецкая і магнацкая. Сялянская сядзіба: уплыў геаграфічных і гістарычных асаблівасцей на знешні воблік; роля эканамічных зносін і камунікацыі ў размяшчэнні сядзібы. Дрэва як асноўны матэрыял сядзібы. Асноўныя збудаванні сядзібы (жыллё, клець, свіран, варыўня, склеп, гумно, сушня, адрына, лазня), іх адметныя асаблівасці (функцыянальная прыналежнасць, месца ў структуры сядзібы, канструкцыя і г. д.); тыпы і характар размяшчэння ў агульнай планіроўцы (вяночная, пагонная, двух-трохрадная, сцяжковая, свабодная і інш.). Сістэмы размяшчэння, улік мэтазгоднасці збудавання, логікі ўсяго сядзібнага комплексу, камунікацыі, гігіены, асабовых патрабаванняў гаспадара і інш. Млын і кузня як асобныя збудаванні кагарнага характару. Шляхецкая і магнацкая сядзіба як узоры маёнткаў. Фальварачныя і гарадскія маёнткі: адметныя рысы, асноўныя матэрыялы, асаблівасці планіроўкі, шматлікая колькасць збудаванняў (канюшня, млын, пякарня, сырніца, вяндлярня, пасека, рамесныя майстэрні і інш.), аб'ёмна-прасторавае вырашэнне, шматпавярховасць, сувязь з суседскімі маёнткамі. Сядзібы Завоссе А. Міцкевіча, Кушляны Ф. Багушэвіча, Мерачоўшчына Т. Касцюшкі, Убель С. Манюшкі, Багданава Ф. Рушчыца, Калюжыца сям'і Ваньковічаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастаўляны К. Каліноўскага, Залессе М. Агінскага і інш. Гістарычныя змены ў сядзібным комплексе на тэрыторыі беларускіх зямель.

Дрэва як асноўны матэрыял народнага дойлідства. Віды і асаблівасці парод дрэва (сасна, дуб, елка, асіна, бяроза і інш.) і характар іх выкарыстання ў дойлідстве. Традыцыйныя погляды і дзеянні па выбары і падрыхтоўцы будаўнічага матэрыялу; святы і абрады, прысвечаныя працэсу падрыхтоўкі леса. Асноўныя тэхнічныя прыёмы (счэсванне, страганне, распілоўка, выдзёўбванне і г. д.) і інструменты (тапор, піла, цясла, долата, ватэрпас, шнур і інш.) у народным дойлідстве. Асаблівасці будаўнічых канструкцый (зрубленая, слупавая, зрублена-слупавая) і тэхналогій будаўніцтва (укладка вянца, замацаванне лігар і штандараў; з'яўленне каменнага падмурка; спосабы заканчэння дахаў і г.д.).

*Тэма 6. Інтэр'ер жылля ў Беларусі*

Паняцце «інтэр'ер». Гістарычныя і сацыяльныя асаблівасці інтэр'ера на беларускіх землях. Інтэр'ер сялянскай хаты: хата як сусвет, сімволіка рэчаў, планіроўка (1–2-камерная). Вокны і дзверы. Асаблівасці аздаблення сцен, падлогі і столі. Печ як сімвалічны цэнтр сялянскай хаты. Мэбліроўка: сімволіка прадметаў хаты, універсальны характар прадметаў (і сядзець, і ставіць прадметы, і спаць); асноўныя прадметы (стол, лаўка, стул, «палаці») і дадатковыя або часовыя прадметы (калыскі, куфар, шафа, крэсла, канапа). Асвятленне: лучыны, лучнікі-светачы, «дзяды» і інш.

Інтэр'ер шляхецкага і магнацкага дома. Традыцыі інтэр'ера тыпу «галандскага дома» ў заможнай шляхты і магнатаў. Памеры, планіроўка, функцыянальная прыналежнасць памяшканняў. Спецыфіка стварэння і дэкору печы і коміна. Мэбля і дэкаратыўная атрыбутыка (дываны, кветкі, мелкая пластыка і г. д.). Выкарыстанне партрэтаў, зброі, рыцарскіх і паляўнічых трафеяў у інтэр'еры. Асаблівасці асвятлення: васковыя свечкі і кавальскія прыстасаванні да іх.

*Тэма 7. Асноўныя рамёствы на тэрыторыі беларускіх зямель*

Роля і месца рамесных і прамысловых заняткаў у быце беларусаў. Матэрыяльны свет здабыўных промыслаў (збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, пчалярства і інш.): інструмен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ты, прыстасаванні, асноўныя матэрыялы і тэхнікі вырабу. Існаванне вялікай колькасці спецыяльнасцей па розных відах рамяства. Адметныя рысы сельскай і гарадской рамеснай вытворчасці. Роля мануфактур і навукова-тэхнічнага прагрэсу ў развіцці рамёстваў. Уплыў гістарычных падзей на захоўванне і развіццё прамыслова-рамеснай дзейнасці. Кааперацыя і калекцыяніраванне. Генезіс і развіццё асноўных відаў рамёстваў на беларускіх землях. Традыцыйны беларускі арнамент у рамёствах: віды знакаў, іх сімволіка і семантыка, месцы і ўмовы ўжывання арнаменту.

*Дрэваапрацоўка* (разьба па дрэве, бондарства, цяслярства, сталярства і інш.): выразныя якасці, вырабы для дома, прылады працы, аздабленне разнастайных прадметаў, драўляная скульптура (круглая і рэльефная). *Стальмашнае рамяство*: шэраг спецыяльнасцей (каладзеі, карэтнікі, сталешнікі і інш.), сувязь з рамеснікамі розных спецыяльнасцей (кавалямі, малярамі, скарнякамі і г. д.), віды і формы вырабаў (палазныя і калёсныя транспартныя сродкі, наземныя і надводныя, зімовыя і летнія, рабочыя і святочныя і г. д.), асноўныя тэхнікі і інструменты. *Кавальства* і *сталярства*: традыцыйныя прадметы, тэхнікі і тэхналогіі, стварэнне школ і кагарных майстэрняў. *Ганчарства* і *кераміка*: паходжанне і спецыфіка развіцця; тэхнікі і тэхналогіі; асноўныя прадметы ў кантэксце іх функцыянальнай прыналежнасці (посуд, дэкаратыўная кераміка, цацкі, вырабы гаспадарчага прызначэння і інш.); рэгіянальныя асаблівасці рамяства. *Ткацтва* і *вышыўка*: матэрыялы, тэхнікі і інструментарый; асноўныя віды, асаблівасці колеру і выяў. Гісторыя і традыцыі развіцця габелена ў Беларусі. Тэхнікі, тэхналогіі і найбольш распаўсюджаныя матэрыялы *пляцення* (саломка, лаза, бісер). Асаблівасці беларускай *выцінанкі*. *Шкларобства* і *дэкаратыўны жывапіс* (роспісы па дрэве, тканіне, шкле і г. д.) у Беларусі. *Скураныя рамёствы* (кушнерства, гарбарства, шавецтва).

*Тэма 8. Традыцыйная культура харчавання беларусаў*

Ежа ў сістэме харчавання беларусаў. Асноўныя віды ежы: раслінная і нераслінная (мясная, рыбная); посная ежа і скаромная; паўсядзённая, святочная і абрадавая. Сімволіка кулінарных вырабаў. Ежа ў нацыянальным фальклоры. Ежа сялян, шляхты і магнатаў. Асноўныя прадукты (гародніна, садавіна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малочныя прадукты, мяса, рыба, грыбы, ягады і інш.) і стравы з іх. Асаблівая роля і месца хлеба ў традыцыйнай культуры беларусаў. Разнастайнасць напояў (квас, сок, піва, наліўка, гарэлка і інш.). Віды посуду і культура харчавання. Сінтэз духоўнага, матэрыяльнага і мастацкага ў традыцыйнай ежы беларусаў.

*Тэма 9. Традыцыйны беларускі касцюм*

Паняцці «адзенне» і «касцюм». Сімволіка прадметаў адзення беларусаў. Асноўныя матэрыялы, тэхналогіі і тэхнікі вырабу касцюма. Традыцыйны нацыянальны касцюм: сялянскі, шляхецкі і магнацкі. Жаночае і мужчынскае адзенне: святочнае і паўсядзённае; зімовае і летняе; верхняе і нацельнае; галаўныя ўборы і прычоскі, абутак. Упрыгожванні (прыстасаваныя і з’ёмныя; матэрыялы і тэхнікі). Пояс як неад’емная частка беларускага касцюма (матэрыялы і тэхнікі стварэння, сацыяльныя адметнасці, віды ўзораў і г. д.). Рэгіянальныя асаблівасці беларускага касцюма. Беларускі касцюм у гістарычным ракурсе (трансфармацыя матэрыялаў, тэхнік вырабу, стылістычных адметнасцей, сацыяльных рыс і г. д.). Месца і роля беларускага традыцыйнага касцюма ў сучасным мастацтве (тэатры, харэаграфіі, кіно, тэлебачанні і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Тэмы | Лекцыі | Семінары | КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 1.* Уводзіны. Сувязь мастацка-матэрыяльнай культуры Беларусі з іншымі навукамі гуманітарнага цыкла | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Мастацка-матэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце рэлігійных вераванняў славян | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Паселішча на тэрыторыі беларускіх зямель | 2 | | | |
| *Тэма 4.* Драўлянае і каменнае дойлідства на беларускіх землях | 4 | 2 | 2 | рэферат-прэзентацыя |
| *Тэма 5.* Сядзіба як асноўная частка жыллёвага комплексу | 2 | | 2 | рэферат-прэзентацыя |
| *Тэма 6.* Інтэр'ер жылля ў Беларусі | 4 | | 2 | рэферат-прэзентацыя |
| *Тэма 7.* Асноўныя рамёствы на тэрыторыі беларускіх зямель | 4 | 8 | | |
| *Тэма 8.* Традыцыйная культура харчавання беларусаў | | | 2 | тэст |
| *Тэма 9.* Традыцыйны беларускі касцюм | | 4 | | |
| **Усяго…** | **20** | **14** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Асноўнымі *метадамі (тэхналогіямі) навучання*, якія адэкватна адказваюць мэтам вывучэння дадзенай дысцыпліны, з'яўляюцца метад кантэкстуальнага аналізу, праблемна-пошукавы метад, кампаратыўны падыход і камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, праблемныя дэбаты, круглы стол і інш.).

Аб'ём і змест тэм абумоўлены неабходнасцю падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў у галіне кампаратыўнага мастацтвазнаўства. Важнае месца ў вывучэнні дысцыпліны займае аналіз мастацкіх асаблівасцей твораў матэрыяльнай культуры Беларусі. Матэрыяльная культура ўвасабляе адметныя прыметы пэўнай эпохі, выяўляе эстэтычны ідэал народа, з'яўляецца каштоўнай іканаграфічнай крыніцай для вывучэння яго культуры. Змест дадзенага курса садзейнічае эстэтычнаму выхаванню, дапамагае фарміраванню цэласнага ўяўлення аб эвалюцыі матэрыяльнай культуры, развіццю прасторавага мыслення, творчай фантазіі і здольнасці да вобразнай стылізацыі.

Для больш эмацыянальна-вобразнага ўспрымання твораў матэрыяльнай культуры Беларусі лекцыйны матэрыял павінен суправаджацца слайд-прэзентацыямі. Засваенне матэрыялу курса прадугледжвае самастойную работу студэнтаў над асноўнай і дадатковай літаратурай, прагляд відэафільмаў, мультымедыйных дыскаў, наведванне музеяў і выставачных залаў.

Мэтай самастойнай работы студэнтаў з'яўляецца стымуляванне пазнавальнай актыўнасці, пераход на творчы ўзровень засваення ведаў у развіцці асабістых і прафесійных кампетэнцый.

Самастойная работа студэнтаў арганізавана ў суадносінах з палажэннем аб самастойнай рабоце студэнтаў. Па дысцыпліне распрацаваны вучэбна-метадычны комплекс з матэрыяламі і рэкамендацыямі, якія дапамагаюць студэнтам у працэсе арганізацыі самастойнай работы. Асаблівае месца ў самастойнай рабоце адводзіцца наведванню студэнтамі музеяў, мемарыяльных і архітэктурных комплексаў, культурных цэнтраў і мастацкіх запаведнікаў, якія адлюстроўваюць эстэтыку матэрыяльнай культуры Беларусі.

Для адзнакі якасці самастойнай работы здзяйсняецца кантроль за яе выкананнем. У якасці форм кантролю за выкананнем самастойнай работы прапануецца *тэст* і *рэферат-прэзен-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*тацыя*. *Тэст* – гэта набор пытанняў і заданняў, разлічаных на выбар аднаго правільнага адказу з ліку прапанаваных. У тэсце прапануюцца пытанні вербальнага і візуальнага характару, а таксама творчыя заданні ў кантэксце вывучаемай дысцыпліны. Для падрыхтоўкі да выканання тэста студэнт павінен самастойна вывучыць навуковую, навукова-метадычную, вучэбную літаратуру па пэўнай тэме, скласці план-канспект яе зместу. *Рэферат-прэзентацыя* – гэта аўтарскае даследаванне, якое раскрывае сутнасць зададзенай тэмы, адлюстроўвае і прыводзіць розныя меркаванні аб доследным пытанні або праблеме, прадстаўленае ў выглядзе вуснага даклада ў суправаджэнні візуальнага шэрагу, створанага ў праграме Microsoft PowerPoint. Для стварэння рэферата-прэзентацыі існуе тры этапы. На першым – студэнт уважліва вывучае навуковую, навукова-метадычную, вучэбную літаратуру па пэўнай тэме, складае план-канспект яе зместу, вылучае найбольш важныя навуковыя праблемы. Другі этап прадугледжвае падбор візуальнага шэрагу, які максімальна поўна адлюстроўвае даследуемую тэму. Трэці этап – гэта стварэнне прэзентацыі ў камп'ютарнай праграме Microsoft PowerPoint.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*


*1.* Беларускае народнае адзенне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 96 с.

*2.* Беларусы : у 8 т. – Т. 1. – Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995.

*3.* Беларускае народнае жыллё / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору / пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 126 с.

*4. Валодзька, Ф. І.* Беларуская народная творчасць / Ф. І. Валодзька, Р. Ф. Валодзька. – Мінск : Беларусь, 1975. – 48 с. : іл.

*5. Габрусь, Т. В.* Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя [і інш.]. – Мінск : Полымя, 1998. – 351 с.

*6. Здановіч, Н. І.* Беларуская паліваная кераміка XI–XVIII стст. / Н. І. Здановіч, А. А. Трусаў. – Мінск, 1993. – 183 с.

*7. Кацар, М. С.* Беларускі арнамент : Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар ; пер. з рус. мовы, літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 224 с. : іл.

*8. Лакотка, А. І.* Пад стрэхамі прашчураў / А. І. Лакотка. – Мінск : Полымя, 1995. – 380 с.

*9. Маленка, Л. І.* Беларускі народны касцюм / Л. І. Маленка. – Мінск : Ураджай, 2001. – 123 с.

*10. Милюченков, С. А.* Белорусское народное гончарство : науч. изд. / С. А. Милюченков. – Минск : Наука и техника, 1984. – 183 с. : ил.

*11. Молчанова, Л. А.* Материальная культура белорусов / Л. А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 231с.

*12.* Промыслы і рамёствы Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 192 с.

*13. Сахута, Я. М.* Беларусы : у 12 т. – Т. 8. – Дэкаратыўнаприкладное мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 344 с. : іл.

*14. Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1997. – 286 с. : іл.

*15. Сахута, Я. М.* Народныя мастацкія рамёствы Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2001. – 168 с. : іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Сергачев, С. А.* Белорусское народное зодчество / С. А. Сергачев. – Минск: Ураджай, 1992. – 255 с.
*17. Цітоў, В. С.* Народная культура Беларусі : энцыкл. даведнік / В. С. Цітоў. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с. : іл.

*Дадатковая*

*1. Байбурин, А. К.* Пояс (к семиотике вещей) / А. К. Байбурин // Из культурного наследия народов восточной Европы. – СПб. : Наука, 1992. – С. 5–13.
*2.* Беларускае народнае жыллё / рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 127 с.
*3. Валодзіна, Т. В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 166 с.
*4. Здановіч, Н. І.* Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка / Н. І. Здановіч, А. К. Краўцэвіч, А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 152 с.
*5. Котович, О.* Золотые правила народной культуры / О. Котович. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2008. – 592 с. : іл.
*6. Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2001. – 350 с.
*7. Лабачэўская, В. А.* Повязь часоў. Беларускі ручнік : альбом / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2009. – 298 с.
*8. Лесну, Я. Ю.* Дом во времени и пространстве / Я. Ю. Лесну. – Минск : Беларусь, 2000. – 231 с.
*9. Лесну, Я. Ю.* Сімволіка печы ў беларускай народнай хаце / Я. Ю. Лесну. – Мінск : Беларускі дом друку, 2003. – С. 76–79 : іл.
*10. Ненадавец, А.* Печ і грэе і аберагае / А. Ненадавец // Беларус. думка. – 2008. – № 6. – С. 165–169 : іл.
*11. Локотко, А. Н.* Белорусское народное зодчество: середина XIX–XX в. / А. Н. Локотко. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 287 с.
*12. Маслова, Г. С.* Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах XIX – начала XX в. / Г. С. Маслова. – М. : Наука, 1984. – 215 с.
*13. Молчанова, Л. А.* Очерки материальной культуры белорусов XVI –XVIII вв. / Л. А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1981. – 112 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Розенфельдт, Р. Л.* Белорусские изразцы / Р. Л. Розенфельдт // Древности Восточной Европы. – М., 1969. – С. 178–184.

*15. Сахута, Е. М.* Народное нскусство и художественные промыслы Белоруссии / Е. М. Сахута. – Минск: Полымя, 1982. – 96 с. : ил.

*16. Сахута, Е. М.* Художественные ремесла и промыслы Белоруссии / Е. М. Сахута, А. Говар. – Минск : Наука и техника, 1988. – 266 с.

*17. Сахута, Я. М.* Беларуская выцінанка / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2008. – 230 с.: іл.

*18. Сахута, Я. М.* Беларуская народная кераміка / Я. М. Сахута. – Мінск : Полымя, 1987. – 112 с.

*19. Сахута, Я. М.* Фарбы роднай зямлі : Нарысы пра народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Нар. асвета, 1985. – 191 с. : іл.

*20. Трызна, Д. С.* Беларускія дываны і габелены / Д. С. Трызна. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 78 с.

*21. Цітоў, В. С.* Народная спадчына. Гістарычныя шляхі і этнакультурныя стасункі / В. С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

*22. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 2001. – 208 с.

*23. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1997. – 207 с.

*24.* Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

### Рэкамендаваны дыягнастычны інструментарый

Для ажыццяўлення кантралюемай самастойнай работы студэнтаў рэкамендуецца карыстацца дыягнастычным інструментарыем, які мае рознаўзроўневы характар і прымяняецца комплексна. У якасці аднаго са сродкаў кантролю і ацэнкі могуць быць выкарыстаны крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным або некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух мностваў з адным або некалькімі суадносінамі і аднолькавай або рознай колькасцю элементаў у мноствах; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці, якія дапускаюць фармалізаваны адказ.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць заданні адкрытай формы са свабодна канструяваным адказам, праблемныя і творчыя задачы, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

Кафедра, за якой замацавана чытанне дысцыпліны «Матэрыяльная культура Беларусі», мае права вызначаць віды і перыядычнасць ажыццяўлення кантрольна-ацэначнай дзейнасці з улікам структуры зместу вучэбнай дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства*
*(інтэграванае), спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтва*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,85. Ул.-выд. арк. 0,65. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ